**З блакітным палівам паўвека** // Родныя выток (Докшыцы). – 2018. – 1 верас. – С. 4.

# З БЛАКІТНЫМ ПАЛІВАМ ПАЎВЕКА

***Газ, як адзін з важнейшых энерганосьбітаў, як экалагічна чыстае паліва, з'яўляецца асновай энергарэсурсаў любой краіны. Яго выкарыстанне ў прамысловасці і быце немагчыма перааценіць. У Беларусі газ у народную гаспадарку прыйшоў у 60-я гады мінулага стагоддзя. У сакавіку 1960 года быў створаны Віцебскі мантажна-эксплуатацыйны ўчастак, які прыступіў да мантажу газабалонных установак. Для калектыву Докшыцкага раёна газазабеспячэння сёлетняе прафесійнае свята адметнае: на яго прыпаў 50-гадовы юбілей заснавання арганізацыі.***

У Докшыцкі раён газ прыйшоў у 1966 годзе, а праз два гады ў жніўні было створана ўпраўленне газазабеспячэння. У 1974-м увялі ў эксплуатацыю першую рэзервуарную ўстаноўку па вул. Школьнай у райцэнтры. Больш актыўнае развіццё галіны распачалося праз год. Быў створаны Докшыцкі ўчастак Лепельскага міжраённага ўпраўлення пад кіраўніцтвам старшага майстара Рыгора Юпатава. Яго на гэтай пасадзе змяніў Мікалай Кеда. Працавала тады на ўчастку толькі 11 чалавек. Кантора месцілася ў звычайным вагончыку.

Наступным этапам развіцця арганізацыі можна лічыць будаўніцтва вытворчай базы напачатку 80-х гадоў. Былі ўведзены ў строй склад балонаў, майстэрні, адміністрацыйны корпус. Начальнікамі ўчастка ў гэты час былі Ягор Ралавец, Іван Каросцік, Людвіг Петрашкевіч. У кастрычніку 1997 года ўчастак стаў цэхам звадкаванага газу Лепельскага міжраённага вытворчага ўпраўлення газавай гаспадаркі. Праз два гады быў выведзены з міжраённага падпарадкавання і рэарганізаваны ў Докшыцкае раённае ВУ газавай гаспадаркі (у 2000 годзе стаў філіялам РВУ «Докшыцырайгаз»). Яго ўзначаліў Іосіф Падрэз. Гэта пры ім арганізацыя набыла той выгляд, якім яна і сёння выгадна вылучаецца сярод іншых. Армейскі парадак, ідэальная чысціня ствыралася намаганнямі ўсяго калектыву, а ля вытокаў кветкавай прыгажосці і адметнага дызайну вытворчай тэрыторыі стаяла Тамара Сакавец. Былі пабудаваны запраўка аўтамабіляў звадкаваным газам, кацельная на газавым ацяпленні, рэканструяваны склад балонаў, адміністрацыйны будынак, майстэрні. Праведзена вялікая работа па 100-працэнтным забеспячэнні насельніцтва звадкаваным газам.

Сёння карыстальнікамі гэтага віду паліва з'яўляюцца 7300 абанентаў. За сем месяцаў 2018 года яго рэалізавана 233,7 тоны.

2005 год увайшоў у гісторыю арганізацыі пачаткам будаўніцтва сетак прыроднага газу. Першымі датэрмінова яго атрымалі жыхары шматпавярховікаў у Крулеўшчыне. У 2006 годзе докшыцкую зямлю наведаў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка. У час урачыстасці, якая адбылася на цэнтральнай плошчы райцэнтра, ён запаліў газавы факел і гэтым самым як бы даў дабро на далейшую газіфікацыю раёна прыродным газам. Сёння каштоўнае блакітнае паліва стварае камфорт у 2200 кватэрах і стольких жа прыватных дамах. А працягласць сетак газаправода складае 274 кіламетры. За выгоды прыроднага газу ўдзячны жыхары Докшыц і Бягомля, Крулеўшчыны і Пруднікаў, Лапут і Чырвонага Беразіно, Порплішча і Барсукоў, Параф'янава, Сітцаў і Таргуноў. На прыродным газе працуюць дзве сушылкі, чатыры кацельні. Дзейнасць па газіфікацыі раёна працягваецца, і сёлета ўжо ўведзена ў эксплуатацыю 6,5 кіламетра газаправода.

У 2007 годзе да ВУ «Докшыцырайгаз» было далучана «ляжачае» Крулеўшчынскае торфапрадпрыемства. Рэарганізаваную структуру ўзначаліў Валерый Кавалёў. Без нечага за год яе тарфяная вытворчасць стала дзеяздольнай і атрымала ўпершыню за некалькі апошніх гадоў прыбытак. На змену Кавалёву прыйшоў Віталь Няспляк, пры якім завяршылася станаўленне тарфяной галіны і ператварэнне прадпрыемства ў сучасную вытворчасць па выпуску прадукцыі з рэалізацыяй на сусветным рынку.

1 верасня 2015 года адбылася яшчэ адна рэарганізацыя, пасля якой газавікі і тарфянікі зноў раздзяліліся. Докшыцкі раён газазабеспячэння філіяла ВУ «Глыбокаегаз» узначаліў Аляксандр Туркоў. Затым на гэтай пасадзе працаваў Дзмітрый Пахомаў. Зараз калектыў, у якім працуе 47 чалавек, узначальвае Станіслаў Ждановіч, галоўны інжынер – Васіль Яленскі.

Раён газазабеспячэння неаднаразова займаў прызавыя месцы ў аглядах-конкурсах па добраўпарадкаванні, мастацкай самадзейнасці, а таксама спартыўных спаборніцтвах. Райгаз – арганізацыя, працаваць у якой на працягу ўсёй гісторыі яе існавання было прэстыжна і ганарова. Вось таму стаж многіх яе работнікаў вымяраецца не адным дзесяцігоддзем. Сваім станаўленнем яна абавязана Ліліі Яцына, Веры і Івану Даніловічам, Сафіі Буглак, Веры Мажэй, Расціславу Чарапачэвічу, Леаніду Гушчыку, Ніне Міцько, Вячаславу Купрэвічу, Мікалаю Маскалёнку, Валянціне Калантай, Таццяне Галко, Баляславу Хадаронку, Мікалаю Ляху і многім іншым. Заслужанымі работнікамі галіны з'яўляюцца Уладзімір Гмырак, Марыя Салодкая, Уладзімір Голуб.

«…Акрамя тарфяной вытворчасці мы, як вядома, займаемся і забеспячэннем спажыўцоў раёна блакітным палівам. Нашымі кліентамі з’яўляюцца РУП ЖКГ «Докшыцы-камунальнік», абодва санаторыі, хлебазавод, ААТ «Таргуны». Хуткімі тэмпамі ідзе газіфікацыя жылых дамоў. З яе пачатку газіфікавана 332 дамы. Днямі адбудзецца пуск газу ў Параф’янава. Яшчэ 60 кватэр атрымаюць магчымасць карыстацца прыродным газам. Амаль 14 тысяч абанентаў у раёне атрымліваюць балонны газ…»

*В. Кавалёў.*
*Родныя вытокі, 6 верасня 2008 года.*

«…У апошні час стала практыкавацца будаўніцтва падземных газавых установак, якія забяспечваюць палівам некалькі дамоў. Такія ўстаноўкі з’явіліся ў Докшыцах па вул. Чарняхоўскага, па вул. К. Маркса, па вул. Школьнай. Было запланавана ўвесці ў эксплуатацыю газаўстаноўку ў калгасе «Камсамолец», аднак у ёй выяўлена шмат недахопаў. У саўгасах «Сітцы», «Вітунічы», племзаводзе «Порплішча» калгасе імя Суворава для перавозкі газавых балонаў са склада ў гаспадарках да абанентаў не выдзяляецца транспарт. Людзі вымушаны перавозіць іх на матацыклах, на калёсах, веласіпедах. А гэта грубае парушэнне правілаў бяспекі…»

*Е. Раловіч.*
*Ленінская трыбуна, 20 чэрвеня 1978 года.*

«…Докшыцкі цэх звадкаванага газу абслугоўвае больш чым шэсць кіламетраў падземнага газаправода, які злучае ёмістасці агульнага карыстання з газавымі ўстаноўкамі спажыўцоў. Такія аб’екты патрабуюць выключнай увагі і строгага захавання правіл тэхнікі бяспекі. Калектыў цэха прыкладае ўсе намаганні, каб не дапусціць бяды. Два разы ў месяц слесары абследваюць падземныя траншэі, правяраюць на ўцечку сам газаправод і іншае абсталяванне. Акрамя гэтага, аварыйная служба раз у месяц праводзіць праверку скляпоў і лесвічных клетак на загазаванасць…»

*Л. Голуб.*
*Ленінская трыбуна, 18 чэрвеня 1988 года.*

***Старонку падрыхтавала Т. Альшэўская і Н. Навіцкая***